# Рэцэнзіі

Н. И. Толстой. **Избранные труды. Т.III: Очерки по славянскому языкознанию.** М.: "Языки русской культуры", 1999. 464 с.

Выйшаў з друку трэці том "Выбраных прац" М.І.Талстога (пра першыя два тамы гл. у №1 і 3 нашага часопіса за 1998 г.). У адрозненне ад быццам бы манаграфічных першых тамоў, новы зміяшчае артыкулы па розных пытаннях славістыкі. Гэтыя пытанні не разглядаліся ў першых тамах. Адбор матэрыялаў у том быў зроблены яшчэ аўтарам. Тут змешчаны дзве працы, суадносныя з абароненай у 1954 г. кандыдацкай дысертацыяй славіста пра поўныя і кароткія прыметнікі ў стараславянскай мове: вялікі артыкул (с.52–170) дае добрае ўяўленне аб гэтай ўзорнай кваліфікацыйнай рабоце дэскрыптыўнага характару, у другім артыкуле даследчык праз дваццаць гадоў зноў звярнуўся да аднаго з аспектаў гэтай тэмы. У пэўнай меры да той жа тэматыкі належаць тэзісы двух зробленых у 1962 і 1974 гг. дакладаў пра паўднёваславянскія аналагі артыкля. Пяць нататкаў прысвечаны непаслядоўнасці першай палаталізацыі заднепаднябенных у славянскіх мовах на матэрыяле кораняў *geg, *gep, *kek, *kev, *kep. М.І.Талстой высока цаніў, любіў і доўга вёў палявую работу па збору дыялектных матэрыялаў. У Беларусі такая работа была разгорнута ім на Палессі. Але пачыналася дыялекталагічная работа славіста з балгарскіх гаворак, якім прысвечаны тры нататкі "З блакнота дыялектолага". Спецыяльна абмяркоўваў Талстой актуальнае пытанне пра суадносіны цэнтральных і маргінальных моўных арэалаў сучаснай Славіі.

Амаль сотню старонак займаюць у кнізе шэсць артыкулаў раздзела "З гісторыі славістыкі" – пра І.І.Сразнеўскага, І.А.Бадуэна дэ Куртэнэ, А.А.Патабню, Дз.К.Зяленіна, Д.Джуравіча і Р.Бошкавіча, прычым гэта не агульныя агляды творчасці вялікіх папярэднікаў, але аналіз перш за ўсё іх дыялекталагічнай зацікаўленасці. Да гэтага цыклу прымыкае і даклад пра курс "Уводзіны ў славянскую філалогію" на маскоўскім семінары выкладчыкаў стараславянскай мовы ў 1979 г., уведзены за некалькі гадоў перад гэтым як абавязковы прадмет універсітэцкіх вучэбных планаў на аснове рашэнняў, прынятых у маі 1973 г. нарадай у Мінску, у якой М.І.Талстой актыўна ўдзельнічаў разам з С.Б.Бернштэйнам, П.А.Дзмітрыевым. Шкада, што ў раздзел не трапілі работы пра Вука Караджыча, М.С.Трубяцкога, С.Б.Бернштэйна і некаторыя іншыя, у тым ліку надрукаваныя ў апошні час успаміны вучонага, для якога пераемнасць у навуцы, сувязь паміж пакаленнямі была неабходнай часткай развіцця жывой навуковай думкі.

У том уключаны два артыкулы 1979–1980 гг., прысвечаныя этналінгвістычнаму разгляду асобных пытанняў славянскіх моў. Але асноўная частка этналінгвістычных прац славіста пакуль што не ўвайшла ў "Выбраныя працы". Вядома, што ў 1995 г. надрукаваны цікавы зборнік нарысаў М.І.Талстога па славянскай міфалогіі і этналінгвістыцы "Язык и народная культура".У гэтым жа кірунку ішла праца над этналінгвістычным слоўнікам славянскіх старажытнасцей, першы том якога Мікіта Ільіч яшчэ пабачыў у 1995 г. Але "Выбраныя працы" выдатнага вучонага, што сказаў у галіне этналінгвістыкі і даследавання славянскай міфалогіі надзвычай важкае слова, без этналінгвістычных работ выглядаюць незавершана. Неабходна выдаць іх у асобным томе (ці тамах?) "Выбраных прац". Хочацца спадзявацца, што Расійскі гуманітарны навуковы фонд, які падтрымаў выпуск трох тамоў "Выбраных прац", і іншыя ўстановы знойдуць сродкі на завяршэнне як гэтага выдання, так і слоўніка "Славянскія старажытнасці" – справы гонару рускай філалагічнай навукі.

У трэці том увайшла вялікая і дакладная бібліяграфія работ М.І.Талстога. Першая брашура з бібліяграфіяй вучонага была выдадзена ў Самаркандзе яшчэ ў 1983 г. (пра яе гл. у нашым часопісе 1983, №3), потым асобная бібліяграфія друкавалася ў 1993 г., але новая бібліяграфія, што ахапіла 765 пазіцый, натуральна, найбольш поўная. Вельмі цікавым яе дапаўненнем сталі 168 назваў "Літаратуры пра жыццё і працы М.І.Талстога". Можна канстатаваць, што ў сухім спісе публікацый адлюстравалася не толькі дзейнасць выдатнага вучонага, але і развіццё ўсёй савецкай славістыкі за апошнія сорак гадоў.

Работа выдавецтва і рэдактара "Выбраных прац" М.І.Талстога ўспрымаецца славістычнай грамадскасцю са шчырай удзячнасцю.

**А.Я.Супрун**